# Х А Р Т Ы Я З Я М Л І[1]

Сакавік-2000

## ПРЭАМБУЛА

Мы знаходзімся на крытычным этапе ў гісторыі Зямлі, калі чалавецтва павінна абраць сваю будучыню. Так як свет становіцца ўсё больш і больш узаемазалежным і далікатным, будучыня абяцае адначасова і вялікую небяспеку, і вялікія перспектывы. Каб рухацца наперад, мы павінны ўсвядоміць, што пры ўсёй пышнасці разнастайнасці культур і спосабе жыцця мы – адзінаячалавечая сям'я і супольнасць адзінай Зямлі з агульным лёсам. Мы павінны аб'яднацца, каб стварыць устойлівую глабальную супольнасць, заснаваную на павазе да прыроды, усеагульных праў чалавека, эканамічнай справядлівасці і культуры свету. У гэтым імкненні асабліва важна тое, што мы, людзі Зямлі, абвяшчаем нашу адказнасць адзін перад адным, перад вялікай супольнасцю жывога, і перад будучымі пакаленнямі.

**Зямля, наш дом**

Чалавецтва з'яўляецца часткай шырокага эвалюцыяніруючага сусвету. Зямля, наш дом, жывая і нясе на сабе ўнікальную супольнасць жыцця. Сілы прыроды робяць існаванне рызыкоўным і ненадзейным, аднак Зямля забяспечвае натуральныя ўмовы, неабходныя для эвалюцыі жыцця. Устойлівасць жывой супольнасці і дабрабыт чалавецтва залежаць ад захавання здаровай біясферы з усімі яе экасістэмамі, багатай разнастайнасцю раслін і жывёл, урадлівай глебай, чыстай вадой і чыстым паветрам. Глабальнае навакольнае асяроддзе з яе абмежаванымі рэсурсамі з'яўляецца агульным клопатам усіх людзей. Ахова жыццяздольнасці, разнастайнасці і прыгажосці Зямлі з'яўляюцца святым абавязкам.

**Глабальная сітуацыя**

Дамінуючыя мадэлі вытворчасці і спажывання выклікаюць спусташэнне навакольнага асяроддзя, вынішчэнне рэсурсаў і масавае выміранне відаў. Супольнасці дэградуюць. Прыбытак ад развіцця размяркоўваецца несправядліва, і разрыў паміж беднымі і багатымі расце. Несправядлівасць, галеча, невуцтва і ўзброеныя канфлікты шырока распаўсюджаны і прычыняюць шмат пакут. Беспрэцэдэнтны рост насельніцтва выклікаў перагрузку сацыяльных і экалагічных сістэм. Асновы глабальнай бяспекі пад пагрозай. Гэтыя тэндэнцыі небяспечныя, алене немінуючыя.

**Выклікі будучыні**

У нас ёсць выбар: сфарміраваць глабальнае партнёрства, каб клапаціцца аб Зямлі і сябар аб сябру, або падвергнуцца рызыцы

[1] Партнерская сеть школ устойчивого развития: межрегиональное сотрудничество и устойчивые изменения: сбор. науч.-метод. матер., рекоменд. и опыта / Под ред. Н.Н. Кошель, С.Б. Савеловой– Минск: Академия последипломного образования, 2014.– с. 245 –252.

самаразбурэння і разбурэння разнастайнасці жыцця. Неабходныя фундаментальныя змены ў нашай сістэме каштоўнасцяў, інстытутах і выяве жыцця. Мы павінны ўсвядоміць, што пры ўмове задавальнення асноўных патрабаванняў, чалавечае развіццё першым чынам мае на ўвазе існаваць даўжэй, а не мець больш. Мы валодаем ведамі і тэхналогіямі, дастатковымі для забеспячэння патрабаванняў усіх людзей і памяншэнні нашага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Глабальнайграмадзянскайсупольнасці неабходна стварыць новыя магчымасці для пабудовы дэмакратычнага і гуманнага свету. Нашы экалагічныя, эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя, і духоўныя праблемы ўзаемазвязаныя, і разам мы зможам выпрацаваць комплексныя рашэнні.

**Усеагульная адказнасць**

Для рэалізацыі гэтых імкненняў мы павінны прыняць рашэнне жыць з пачуццём усеагульнай адказнасці, атаясамліваючы сябе як са ўсёй сусветнай супольнасцю, так і са сваімі мясцовымі суполкамі. Мы з'яўляемсяадн响часоваграмадзянамірозныхнацый і адзінага свету, у якімлакальнае і глабальнаеўзаемазвязаны. Кожныпадзяляеадказнасць за цяперашні і будучыдабрабытчалавечага роду і ўсягожывога ўвогуле. Дух чалавечайсалідарнасці і сваяцтвасаўсімжывымумацоўваецца, калі мы жывем з глыбокайпавагай да цудубыцця, падзякай да дарункажыцця і сціпласцю, адпаведнайместцучалавека ў прыродзе.

Нам вельмі неабходна такое бачанне асноўных каштоўнасцей, якое забяспечыць этычную базу для сусветнай супольнасці, якая фарміруецца. Таму, аб'яднаныя надзеяй, мы сцвярджаем наступныя ўзаемазвязаныя прынцыпы ўстойлівай выявы жыцця ў якасці агульных стандартаў, якімі павінны кіравацца і ацэньвацца паводзіны ўсіх індывідаў, арганізацый, дзелавых кругоў, урадаў і транснацыянальных інстытутаў.

## ПРЫНЦЫПЫ

### І. ПАВАЖАЦЬ І КЛАПАЦІЦЦА ПРА СУПОЛЬНАСЦЬ ЖЫВОГА

***1. Паважаць Зямлю і жыццё ва ўсёй яе шматграннасці***

а. Прызнаць, што ўсё існуючае ўзаемазвязана і кожная форма жыцця каштоўная незалежна ад яе значнасці для людзей.

б. Сцвярджаць веру ў неад'емную годнасць кожнай асобы і інтэлектуальны, мастацкі, этычны і духоўны патэнцыял чалавецтва.

***2. Клапаціцца пра супольнасць жывога з разуменнем, спачуваннем і любоўю***

а. Прызнаць, што разам з правам валодаць, кіраваць і выкарыстоўваць прыродныя рэсурсы з'яўляецца абавязак прадухіляць нанясенне шкоды навакольнаму асяроддзю і абараняць правы людзей.

б. Сцвярджаць, што з ростам волі, ведаў і магчымасцей узрастае адказнасць за садзейнічанне ўсеагульнаму дабрабыту.

***3. Будаваць справядлівыя, сацыяльна інтэграваныя, устойлівыя і мірныя дэмакратычныя суполкі***

а. Забяспечыць, каб грамадства на ўсіх узроўнях гарантавала правы чалавека і асноўныя свабоды, і давала кожнаму магчымасць цалкам рэалізаваць свой патэнцыял.

б. Садзейнічаць сацыяльнай і эканамічнай справядлівасці, якая спрыяе магчымасціўсімавалодаць надзейнымі і істотнымі сродкамі існавання, будучы экалагічна адказным.

***4. Захоўваць шчодрасць і прыгажосць Зямлі для цяперашняга і будучых пакаленняў***

а. Прызнаць, што воля дзеянняў кожнага пакалення вызначаецца запатрабаваннямі будучых пакаленняў.

б. Перадаць будучым пакаленням каштоўнасці, традыцыі і інстытуты, якія падтрымліваюць у доўгатэрміновай перспектыве росквіт чалавечых і экалагічных супольнасцяў Зямлі.

Для ажыццяўлення гэтых чатырох асноўных абавязкаў неабходна:

## II. ЭКАЛАГІЧНАЯ ЦЭЛАСНАСЦЬ

***5. Ахоўваць і аднаўляць цэласнасць экалагічных сістэм Зямлі, надаючы асаблівую ўвагу біялагічнай разнастайнасці і прыродным працэсам, якія забяспечваюць устойлівасць жыцця***

а. Засвоіць на ўсіх узроўнях планы і нормы ўстойлівага развіцця, паводле якіх захаванне і аднаўленне навакольнага асяроддзя інтэгруецца ва ўсе ініцыятывы па развіцці.

b. Для аховы сістэм жыццезабеспячэння Зямлі, падтрымання біяразнастайнасці і захавання нашай прыроднай спадчыны стварацьі ахоўваць жыццяздольныя прыродныя і біясферныя запаведнікі, уключаючы некранутыя землі і акваторыі.

c. Садзейнічаць аднаўленню падвергнутых пагрозамкраявідаў і экасістэм.

d. Кантраляваць і вынішчаць чужародныя або генетычна мадыфікаваныя арганізмы, шкодныя для натуральных відаў і навакольнага асяроддзя, а таксама прадухіляць інтрадукцыю падобных згубных арганізмаў.

e. Кіраваць выкарыстаннем аднаўляемых рэсурсаў, такіх, як вада, глеба, лясы, марскія насельнікі такім чынам, каб не была парушана хуткасць іх рэгенерацыі і была забяспечана ахова здароўя экасістэм.

f. Кіраваць здабычай і выкарыстаннем неаднаўляемых рэсурсаў – карысных выкапняў і вадкагапаліва – такім чынам, каб звесці да мінімуму іх вынішчэнне і не прычыняць сур'ёзнай шкоды навакольнаму асяроддзю.

**6.** ***Практыкаваць прадухіленне шкоды для навакольнага асяроддзя ў якасці леп шага метаду экалагічнай абароны і быць прадбачлівым у выпадку абмежаванасці ведаў або недахопу інфармацыі***

а. Прадпрымаць меры для прадухілення сур'ёзнай або незваротнай шкоды навакольнаму асяроддзю, нават калі навука пакуль не мае поўных і канчатковых дадзеных.

b. Ускласці ця жар прад'яўлення доказаў на тых, хто сцвярджае, што прапануемая дзейнасць не ўяўляе сур'ёзнай пагрозы, і прызнаць краіну-ініцыятара адказнай за прычыненне шкоды навакольнаму асяроддзю.
c. Забяспечыць, каб пры прыняцці рашэнняў улічваліся кумулятыўныя, доўгатэрміновыя, апасродкаваныя, падаленыя і глабальныя наступствы чалавечай дзейнасці.
d. Прадухіліць забруджванне любой часткі навакольнага асяроддзя і не дапускаць назапашвання радыёактыўных, таксічных або іншых шкодных рэчаў.
e. Пазбягаць ваенных дзеянняў, якія наносяць шкоду навакольнаму асяроддзю.

***7. Укараняць і выкарыстоўваць такія структуры вытворчасці, спажывання і ўзнаўлення, якія гарантуюць захаванне рэгенератыўных магчымасцяў Зямлі, падтрымку правоў чалавека і дабрабыт грамадства***
a. Давесці да мінімуму спажыванне рэсурсаў, перапрацоўваць і паўторна выкарыстоўваць матэрыялы, скарыстаныя ў сістэмах вытворчасці, забяспечваць засвой ванне экасістэмамі пакінутых адходаў.
b. Эканомна і эфектыўна выкарыстоўваць электраэнергію, павялічваючы спажыванне крыніц аднаўляльнай энергіі, у тым ліку сонечнай і паветранай.
c. Спрыяць развіццю, укараненню і справядлівай перадачы экалагічных тэхналогій.
d. Паказваць поўны экалагічны і сацыяльны кошт тавараў і паслуг у спажывецкім кошце, і ствараць магчымасць спажыўцу ідэнтыфікаваць прадукты, адпаведныя вышэйшым сацыяльным і экалагічным стандартам.
e. Гарантаваць агульны доступ да медыцынскіх паслуг, якія забяспечаць рэпрадуктыўнае здароўе і рэгуляванае ўзнаўленне.
f. Засвоіць вобраз жыцця, які надае адмысловае значэнне якасці жыцця і матэрыяльнаму дастатку ў маючым межы свеце.

***8. Развіваць вывучэнне экалагічнай устойлівасці і спрыяць адкрытаму абмену і шырокаму ўжыванню набытых ведаў***
a. Падтрымліваць міжнароднае навуковае і тэхнічнае супрацоўніцтва ў сферы ўстойлівасці, надаючи адмысловае значэнне патрэбам краін, якія развіваюцца.
d. Прызнаваць і зберагаць традыцыйныя веды і духоўную мудрасць ва ўсіх культурах, якія ўносяць лепту ў ахову навакольнага асяроддзя і дабрабыт чалавецтва.
c. Забяспечыць, каб жыццёва важная для здароўя чалавека і аховы навакольнага асяроддзя інфармацыя, уключаючи генетычныя пытанні, стала ўсеагульным набыткам.

## III . САЦЫЯЛЬНАЯ І ЭКАНАМІЧНАЯ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

***9. Выкараняць галечу, разглядаючы гэты прынцып як этычны, сацыяльны і экалагічны імператыў***

a. Гарантаваць права на пітную ваду, чыстае паветра, харчовую бяспеку, незабруджаную глебу, прытулак і бяспечныя санітарныя ўмовы шляхам размеркавання неабходных нацыянальных і міжнародных рэсурсаў.

b. Забяспечваць кожнаму чалавеку доступ да адукацыі і рэсурсаў, патрэбных для гарантавання ўстойлівых сродкаў для існавання, стварыць сеткі сацыяльнага страхавання і бяспекі для тых, хто няздольны ўтрымліваць сябе.

c. Прызнаваць адрынутых, абараняць абражаных, падтрымліваць тых, хто пакутуе, ствараць умовы для развіцця іх здольнасцей і здзяйснення іх памкненняў.

***10. Гарантаваць, каб эканамічная дзейнасць інстытутаў усіх узроўняў спрыяла развіццю чалавека трывалым і справядлівым чынам***

a. Падтрымліваць справядлівае размеркаванне багаццяў у межах нацый і паміж народамі.

b. Узмацняць інтэлектуальныя, фінансавыя, тэхнічныя і сацыяльныя рэсурсы тых краін, што развіваюцца, і вызваліць іх ад міжнародныхвыплат.

c. Гарантаваць, каб гандаль падтрымліваў устойлівае выкарыстанне рэсурсаў, ахову навакольнага асяроддзя і прагрэсіўныя працоўныя стандарты.

d. Патрабаваць ад транснацыянальных карпарацый і міжнародных фінансавых арганізацый празрыстай дзейнасці і адказнасці дзеля ўсеагульнага дабрабыту.

***11. Умацоўваць гендэрную роўнасць і справядлівасць як перадумову трывалага развіцця і забяспечваць доступ да адукацыі, аховы здароўя і эканамічных магчымасцей ва ўсім свеце***

a. Абараняць правы жанчын і дзяўчат і спыніць усялякі гвалт над імі.

b. Спрыяць актыўнаму ўдзелу жанчын ва ўсіх сферах эканамічнага, палітычнага, грамадскага, сацыяльнага і культурнага жыцця ў якасці паўнапраўных і раўнапраўных партнёраў, асоб, што прымаюць рашэнні, лідэраў і бенефіцыяраў.

c. Умацоўваць інстытут сям’і, гарантаваць бяспеку ўсіх яе членаў і выхаванне дзяцей у атмасферы любові.

***12. Абараняць правы ўсіх людзей, без дыскрымінацыі, на прыроднае і сацыяльнае наваколле, якое падтрымлівае чалавечую годнасць, фізічнае і духоўнае здароўе; пры гэтым надаваць асаблівую ўвагу правам карэннага насельніцтва і меншасцей***

a. Выкараняць дыскрымінацыю ва ўсіх яе праявах, у тым ліку дыскрымінацыю па колеры скуры, сэксуальнай арыентацыі, расавай, рэлігійнай, гендэрнай, моўнай, нацыянальнай, этнічнай ці сацыяльнай прыкмеце.

b. Падтрымліваць правы карэннага насельніцтва на ўласныя духоўнасць, веды, землі, рэсурсы і традыцыйныя ўстойлівыя мадэлі жыццядзейнасці.
c. Паважаць і падтрымліваць моладзь, даючы ёй магчымасць выканаць сваю неабходную ролю ў стварэнні трывалага грамадства.
d. Ахоўваць і рэстаўрыраваць адметныя месцы культурнага і духоўнага значэння.

## IV. ДЭМАКРАТЫЯ, АДМОВА АД ГВАЛТОЎНЫХ МЕТАДАЎ, ЗГОДА

***13. Узмацняць дэмакратычныя інстытуты на ўсіх узроўнях і забяспечваць празрыстасць і падсправаздачнасць улады, удзел у прыняцці рашэнняў і доступ да правасуддзя***

a. Забяспечваць права кожнага чалавека на атрыманне яснай і своечасовай інфармацыі па пытаннях экалогіі і ўсіх планах і дзеяннях, якія могуць закрануць яго, ці ў якіх ён можа быць зацікаўлены.
b. Падтрымліваць мясцовую, рэгіянальную і сусветную грамадскую супольнасць і спрыяць мэтанакіраванаму ўдзелу ўсіх зацікаўленых асоб і арганізацый у прыняцці рашэнняў.
c. Ахоўваць правы на свабоду меркавання, самавыяўлення, сходаў, асацыяцый і разыходжанне ў поглядах.
d. Усталяваць эфектыўны і дзейны доступ да адміністрацыйных і незалежных судовых працэдур, а таксама да сродкаў кампенсацыі за нанясенне шкоды навакольнаму асяроддзю і пагрозу такой шкоды.
e. Выкараняцькарупцыюваўсіхграмадскіх і прыватныхустановах.
f. Узмацняць мясцовыя супольнасці, даючы ім магчымасць ахоўваць навакольнае асяроддзе; прызначыць абавязкі па ахове экалогіі тым органам улады, якія найлепшым чынам гэтыя абавязкі могуць выканаць.

***14. Інтэграваць у фармальнуюадукацыю і бесперапыннаенавучанне веды, каштоўнасці і вопыт, неабходныя для ўстойлівага ладу жыцця***

a. Забяспечваць усіх людзей, асабліва дзяцей і моладзь, адукацыйнымі магчымасцямі, якія дазволяць ім рабіць актыўны ўклад у трывалае развіццё.
b. Спрыяць пашырэнню мастацтва, гуманітарных і прыродазнаўчых навук у адукацыі ў галіне ўстойлівасці.
c. Пашыраць ролю сродкаў масавай інфармацыі ў павелічэнні інфармаванасці насельніцтва аб экалагічных і сацыяльных зменах.
d. Прызнаваць значнасць маральнай і духоўнай адукацыі для ўстойлівага ладу жыцця.

***15. Ставіцца з павагай і спагадай да ўсяго жывога***

a. Не дапускаць жорсткага абыходжання з жывёламі, якія ўтрымліваюцца чалавекам, і абараняць іх ад пакутаў.
b. Абараняць дзікіх жывёл ад такіх сродкаў і метадаў палявання на іх, якія выклікаюць моцныя, працяглыя пакуты, а таксама пакуты, якіх можна было б пазбегнуць.

c. Спыніць ці пазбягаць у максімальна магчымай ступені злову і знішчэнню тых відаў, якія не з’яўляюцца мэтай паляўнічай дзейнасці.

*16. Фарміраваць цывілізацыю талерантнасці, негвалтоўнасці і згоды*

a. Спрыяць узаемапаразуменню, салідарнасці і супрацоўніцтва паміж усімі нацыямі і народамі.

b. Выкарыстоўваць розныя шляхі папярэджання гвалтоўных канфліктаў і супрацоўнічаць пры наяўнасці экалагічных і іншых супярэчнасцеў.

c. Дэмілітарызаваць сістэмы нацыянальнай бяспекі да ўзроўню толькі абароны, выключаючы магчымасць нападзення, і пераанакіраваць вайсковыя рэсурсы на мірныя мэты, такія як экалагічная рэабілітацыя.

d. Ліквідаваць ядзерную, біялагічную, хімічную зброю і любую іншую зброю масавага знішчэння.

e. Гарантаваць выкарыстанне арбітальнай і касмічнай прасторы ў мэтах міру і аховы наваколля.

f. Усведамляць, што свет ёсць суцэльнасць, створаная справядлівым стаўленнем да сябе, іншых людзей, іншых культур, іншага жыцця, Зямлі і да ўсяго велізарнага адзінства, часткай якога мы з’яўляемся.

## ШЛЯХ НАПЕРАД

Як ніколі раней у гісторыі, агульны лёс заклікае нас шукаць новы пачатак. Такое аднаўленне абяцаюць нам прынцыпы Хартыі Зямлі. Для дасягнення гэтай перспектывы мы павінны ўзяць на сябе абавязак прыняць і падтрымліваць каштоўнасці і ідэалы Хартыі.

Гэта патрабуе змен як рацыянальных, так і пачуццёвых. Гэта патрабуе пераасэнсавання глабальных узаемазалежнасці і адказнасці. Мы павінны творча развіваць і выкарыстоўваць светапоглядную канцэпцыю ўстойлівага ладу жыцця на лакальным, нацыянальным, рэгіянальным і глабальным узроўнях. Наша культурная разнастайнасць ёсць каштоўная спадчына, таму розныя культуры знойдуць свае, непаўторныя, шляхі рэалізацыі дадзенай канцэпцыі. Мы павінны паглыбіць і пашырыць глабальны дыялог, вынікам якога стала Хартыя Зямлі, таму што можам шмат чаму навучыцца ў агульным пошуку праўды і мудрасці.

У жыцці часта ўзнікаюць супярэчнасці паміж найважнейшымі каштоўнасцямі. Гэта вядзе да праблем выбару. Але мы павінны знайсці шляхі выкарыстання свабодыдля гарманізацыі разнастайнасці і еднасці, агульнага дабрабыту, вырашэння кароткатэрміновых задач і дасягнення доўгатэрміновых мэт. Кожная асоба, сям’я, арганізацыя адыгрываюць сваю важную ролю ў жыццігрaмадства. Прызванне мастацтва, навукі, рэлігіі, навучальных устаноў, сродкаў масавай інфармацыі, бізнэс-колаў, няўрадавых устаноўіўрадаў –крэатыўнае кіраўніцтва. Супрацоўніцтва паміж урадам, грамадскай супольнасцю і прадпрымальніцтвам неабходна для эфектыўнага кіравання.

Каб пабудаваць устойлівае глабальнае грамадства, народы ўсяго свету павінны пацвердзіць свае абавязкі перад Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый,

выканаць свае абавязкі паводле існуючых міжнародных пагадненняў і падтрымаць рэалізацыю прынцыпаў Хартыі Зямлі, абапіраючыся на неабходныя міжнародныя прававыя механізмы ў сферы навакольнага асяроддзя і развіцця.

Няхай наш час запомніцца, як час абуджэння павагі да жыцця, цвёрдай рашучасці ў дасягненні ўстойлівасці, паскарэння барацьбы за справядлівасць і згоду ва ўсім свеце, як час радаснага святкавання жыцця.

## *ПАХОДЖАННЕ ХАРТЫІ ЗЯМЛІ*

*Хартыя Зямлі была створана незалежнай Камісіяй Хартыі Зямлі, скліканай пасля Саміту Зямлі ў 1992 годзе з мэтай выпрацоўкі сусветнага пагаднення аб каштоўнасцях і прынцыпах дзеля ўстойлівай будучыні. Дакумент ствараўся на працягу дзесяці гадоў шляхам шырокага абмеркавання на міжнародным узроўні, у якім прынялі ўдзел больш за пяць тысяч чалавек. Хартыя была афіцыйна падпісана тысячамі арганізацый, у тым ліку UNESCO і МСАП (Міжнародным саюзам аховы прыроды). Дадатковую інфармацыю можна атрымаць на сайце www.EarthCharter.org.*